Зайко А. М., студ. гр. 501 ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Лабачэўская В.А.,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ ФАЛЬКЛОРНА-МІФАЛАГІЧНАГА ВОБРАЗА СУСВЕТНАГА ДРЭВА

Адным з універсальных сімвалаў у кантэксце фальклору, міфалогіі і культуры ў цэлым, які забяспечвае шматаспектнасць успрымання Сусвету, з'яўляецца дрэва. Паводле І. Швед, «асобны сакральны статус дрэў замацоўваўся ў міфах пра вялікую ролю дрэў ва ўзнікненні, структуралізацыі Сусвету, а таксама ў з'яўленні самога чалавека, эвалюцыйна розных элементаў светабудовы і выявіўся ў розных варыянтах мадэлявання вобраза дрэва» [3, с. 52].

У розных культурах свету развіты свае канцэпцыі Сусветнага дрэва, якая ўвасабляюць зараджэнне быцця. Нягледзячы на адметнасці можна вылучыць і агульныя элементы Сусветнага дрэва: неапісальна вялікі памер, тоеснасць з паняццем стваральнага цэнтру і восі міра (*axis mundi*). Аднак галоўнымі паказчыкамі вобраза Сусветнага дрэва з'яўляюцца ўніверсальнасць і шматаспектнасць.

У кантэксце славянскай міфалогіі гэта пытанне распрацоўваецца Т. Агапкінай, Д. Зяленіным, У. Пятрухіным, М. Талстым, С. Токаравым, А. Топаравым. Значны ўплыў у асэнсаванне нацыянальнай спецыфікі вобраза Сусветнага дрэва ўносяць айчынныя даследчыкі Л. Дучыц, М. Малоха, В. Новак, І. Швед і інш.

Зараджэнне вераванняў, звязаных з Сусветным дрэвам, адбывалася падчас з'яўлення славянскай міфалогіі вылучэння старажытных славян з індаеўрапейскай супольнасці ў перыяд з II па I тыс. да н. э. Вобраз Сусветнага дрэва выяўлены або рэканструяваны на аснове міфалагічных, а дакладней касмалагічных уяўленняў, зафіксаваны у тэкстах розных жанраў, помніках выяўленчага мастацтва (жывапіс, арнамент, скульптура, гліпціка, вышыўка і інш.), архітэктурных збудаваннях (найперш культавых), начынні у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырокім сэнсе слова, рытуалах і інш. Ён  характэрны для славянскіх загадак, замоў, калядных песень. Напрыклад, у беларускай калядцы з евангельскім сюжэтам сам Бог нараджаецца на дрэве, якое адзначае міфалагічны цэнтр: *«На вашэм дварэ дрэва стаяла. // Раю раіўся, Хрыстос нарадзіўся. // На том дрэве цесовая короваць, // а той короваці Божая маці // Сына радзіла»* [4, с. 144]. Такое старажытнае дрэва (бяроза, дуб, явар),  якое размяшчаецца ў цэнтры света і расце "на моры-акіяне ўверх каранямі", узгадваецца ў многіх замовах [1, с. 152.]. У фальклорных тэкстах, звязаных з Сусветным дрэвам, сустракаюцца вобразы Ісуса Хрыста, Багародзіцы, Іллі, Георгія, архангела Міхаіла і інш.; міфілагізаваных персанажаў – кавалёў.

Сусветнае дрэва з'яўляецца дамінантай, якая вызначае фармальную і змястоўную арганізацыю сусветнай прасторы.  Пры чляненні вобраза Касмічнага дрэва па вертыкалі вылучаюцца ніжняя (карані), сярэдняя (камель) і верхняя (галлё і крона). Траістасць Сусветнага дрэва падкрэслівае аднясенне да кожнай часткі пэўнага класа істот, часцей за ўсё жывёл (радзей боствау і іншых міфічных песанажаў). З верхняй часткай, галінамі і кронай, звязваюцца птушкі. У міфах і замовах яны размяшчаюцца на дрэве дзве  - сіметрычна або адна – на вяршаліне. З сярэдняй часткай асацыююцца капытныя (алень, лось, карова, конь і інш.), радзей пчолы, у больш позніх традыцыях і чалавек. З ніжняй – балотныя чарапахі, змеі, жабы, мышы, бабры, выдры, рыбы, часам мядзведзь або пачвары хтанічнага свету.

Вобраз Сусветнага дрэва можа замяняцца вобразам стаўпа, калоды, куста, залатога стула, алтара. Фальклорнымі аналагамі выступаюць бабы (гарох) або вінаградная лаза, сцяблiны якіх сягаюць нябёсаў [2, с. 253].  У сваю чаргу гэта мадэль выкрышталізавала і іншыя сінанімічныя паняцці: Дрэва жыцця, Касмічнае дрэва, Дрэва пазнання, Дрэва жаданняў, Дрэва душы, Дрэва жыццёвага шляху.

У культурным развіцці чалавецтва канцэпт Сусветнага дрэва пакінуў адбіткі ў шматлікіх касмаганічных, рэлігійных і міфалагічных уяўленнях, адлюстраваных у мове, у слоўных тэкстах рознага кшталту, у планіроўцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасяленняў, у гульнях, харэаграфіі, у сацыяльных і эканамічных структурах, магчыма, у некаторых праявах чалавечай псіхікі, напрыклад, “тэст Коха” ў псіхалогіі [5].

Больш познія варыянты схем ілюстравання цэлага, якое складаецца са шматлікіх элементаў шырока выкарыстоўваюцца ў сучасных навуках (лінгвістыка, матэматыка, кібернэтыка, хімія, эканоміка і інш.), там, дзе разглядаюцца працэсы “разгалінавання” з нейкага адзінага “цэнтра”: Дрэва Фенвіка[1], Дрэва Фібаначчы[2], Дрэва Штэрна-Брока[3], Дрэва Піфагора[4]. Такія “дрэвы” атрымалі ў навуцы тэрмін – звязаныя ацыклічныя графы [5].

Такім чынам, канцэпт Сусветнага дрэва з’яўляецца архаічнай адзінкай, прадстаўленай не толькі ў міфа-фальклорнай спадчыне. Яго трансфармацыі мы фіксуем у сучасным навуковым пазнанні, што абумоўлена такімі характарыстыкамі Сусветнага дрэва, як сістэмнасць, упарадкаванасць, разгалінаванасць. Калі ў архаічную эпоху гэтыя характарыстыкі раскрывалі структуру Сусвету ў цэлым, то сёння яны рэпрэзентуюць яе ў кантэксце пэўнай навуковай дысцыпліны або тэорыі.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Дучыц, Л. Сакральная геаграфія Беларусі / Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 384 с. : іл.
2. Толстой Н. Vita herbae et vita rei в славянской народной традиции // Славянский и балканский фольклор. Верования. Текст. Ритуал. Москва: 1994. С. 139-167
3. Топоров, В. Древо мировое // Мифы народов мира. Т. 1. – Москва: 1991. – С. 398-406.

[1]Дрэва Фенвіка (матэматыка) - структура дадзеных, якая дае магчымасць хутка змяняць значэнні ў масіве і знаходзіць некаторыя функцыі ад элементаў масіва.
[2]Дрэва Фібаначчы(геаметрыя) – АВЛ-дрэва з найменшай колькасцю вяршынь пры зададзенай вышыні (глыбіні).
[3]Дрэва Штэрна-Брока[3] (матэматыка) - спосаб размяшчэння ўсіх неадмоўных нескарачальных дробаў ў вяршынях уладкаванага бясконцага двайковага дрэва).
[4]Дрэва Піфагора[4](геаметрыя) – разнавіднасць фрактала, заснаваная на фігуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Швед, I. Дэндралагічны код беларускагатрадыцыйнагафальклору: Манагр. / Навук. рэд. Фядосік А.С.; Нац. акад. Навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклоруімяК.Крапівы, Брэсц. дзярж. ун-т імяА.С.Пушкіна
5. Дерево (теория графов). [Электронны рэсурс] / Рэжым доступа:http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%94%D0%B5%D1%80%D0%B5%D0%B2%D0%BE_(%D0%B3%D1%80%D0%B0%D1%84)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ